Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»

Ж. В. Косціна

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ЯНА ЧАЧОТА

Практыкум
для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей

Репозиторий БарГУ

Баранавічы
БарДУ
2015

УДК [821.161.3.09+929 Чачот](075.8)
ББК 83.3(4Беи)я73
К72

Рэцэнзенты:
кандыдат педагагічных навук установы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт» В. І. Козел,
старшы выкладчык кафедры філалогіі ўстановы адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»
Г. І. Ваўчок

**Косціна, Ж. В.**
К72 Вывучэнне творчасці Яна Чачота : практыкум / Ж. В. Косціна ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт. — Баранавічы : БарДУ, 2015. — 42 с.
ISBN 978-985-498-639-5.

Прапанаваныя пытанні і заданні дапамогуць у асэнсаванні жыццёвага і творчага шляху Яна Чачота, прадстаўніка беларускай літаратуры XIX ст., а таксама твораў аўтара з мэтай практычнага выяўлення асаблівасцей паэзіі і публіцыстычнай дзейнасці дадзенага творцы.

Прызначаны для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, якія вывучаюць гісторыю беларускай літаратуры, а таксама для выкладчыкаў, магістрантаў і настаўнікаў беларускай літаратуры.

**УДК [821.161.3.09+929 Чачот](075.8)**
**ББК 83.3(4Беи)я73**

---

*Вучэбнае выданне*

**Косціна** Жанна Вячаславаўна

ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ
ЯНА ЧАЧОТА

Практыкум
для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей

Адказны за выпуск А. Г. Хахол
Тэхнічны рэдактар Г. Ю. Сідарэнка
Камп'ютарная вёрстка С. М. Глушак
Карэктар С. А. Беразнюк

Падпісана ў друк 26.11.2015. Фармат 60 × 84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,60. Ул.-выд. арк. 1,90. Тыраж 70 экз. Заказ 1024.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/424 ад 02.09.2014.
Вул. Войкава, 21, 225404, г. Баранавічы.
Тэл. 8 (0163) 45 46 28, e-mail: rio@barsu.by .

**ISBN 978-985-498-639-5**
© БарДУ, 2015

Репозиторий БарГУ

# ПРАДМОВА

У высвятленні генезісу новай беларускай літаратуры побач з бясспрэчнымі дасягненнямі сучасных даследчыкаў у гэтай галіне ўсё яшчэ застаецца традыцыйнай недаацэнка творчасці Яна Чачота і ролі яго паэзіі ў фарміраванні нацыянальнага зместу айчыннага прыгожага пісьменства. Пра гэта сведчыць адсутнасць асобных манаграфічных даследаванняў жыццёвага і творчага шляху паэта, а таксама распрацовак метадычнага характару, дзе былі б прадстаўлены шляхі і спосабы вывучэння яго літаратурна-мастацкай спадчыны. Вучэбнае выданне «Вывучэнне творчасці Яна Чачота» мае мэтай пазнаёміць студэнтаў з асаблівасцямі творчасці пачынальніка, яго ўкладам у скарбніцу беларускай літаратуры. Практыкум складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па дысцыпліне «Гісторыя беларускай літаратуры» для студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей: «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова», зацверджанай 30 чэрвеня 2014 г., рэгістрацыйны № УД-ф-170/14 р. ФСГМ; «Беларуская мова і літаратура», зацверджанай 30 чэрвеня 2014 г., рэгістрацыйны №УД-ф-175/14 р.

Пытанні і заданні для самаправеркі, самападрыхтоўкі і правядзення семінарскіх заняткаў з мэтай выяўлення ўзроўню засваення творчасці Я. Чачота дапаўняюцца таксама мастацкімі тэкстамі, якія суправаджаюцца каментарыямі, пытаннямі і заданнямі, што дазваляе фарміраваць навыкі аналізу літаратурнага тэксту, выпрацоўваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў, выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры. Таксама прапануецца тэст па выяўленні ўзроўню ведаў студэнтаў, а таксама ключы да тэста.

Аўтар выказвае спадзяванне, што прапанаваны матэрыял будзе спрыяць выпрацоўцы трывалых навыкаў самастойнай работы студэнтаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і іншымі крыніцамі інфармацыі, ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай ўдасканалення прафесійнай дзейнасці.

*Ж. В. Касціна*

Рэпазіторый БарДУ

## РАЗДЗЕЛ 1
# ЯН ЧАЧОТ — ПРАДСТАЎНІК НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў

1. У якіх гістарычных умовах праходзіла станаўленне новай беларускай літаратуры?

2. Якую канцэпцыю прапануе даследчыца айчыннай літаратуры XIX — пачатку XX ст. І. Багдановіч? У чым яе сутнасць? Узгадайце, якія яшчэ ёсць версіі пра перыядызацыю беларускай літаратуры, хто з’яўляецца іх аўтарам.

3. Якія праблемы ўздымалі беларускія аўтары ў сваёй творчасці? Падмацуйце прыкладамі.

4. Назавіце чатыры крыніцы, якія жывілі працэс станаўлення новай беларускай літаратуры. Раскрыйце іх сутнасць.

5. Узгадайце два кірункі, якія ўплывалі на фарміраванне нацыянальнай беларускай традыцыі.

6. Чым тлумачыцца феномен польскамоўнай творчасці ў Беларусі? Што становіцца падставай для таго, каб разглядаць творчасць В. Каратынскага, У. Сыракомлі, А. Міцкевіча, Я. Чачота, якая бытавала ў асноўным на польскай мове, у кантэксце беларускага літаратурнага працэсу?

7. Дзе і калі нарадзіўся Ян Чачот? Што паўплывала на фарміраванне светапогляду паэта?

8. Ахарактарызуйце гістарычны момант, калі адбывалася станаўленне творчай асобы Яна Чачота. Што звязвала Яна з-пад Мышы з Адамам Міцкевічам?

9. Дайце ацэнку дзейнасці Яна Чачота ў тайных студэнцкіх таварыствах.

10. Што дае падставу меркаваць пра Яна Чачота як пра адказнага чалавека і таленавітага творцу ў філамацкі перыяд творчасці?

11. Чые навуковая меркаванні мелі ўплыў на маладога Яна Чачота?

12. Хто з французскіх філосафаў паўплываў на выбар жыццёвых прыярытэтаў нашага земляка?

13. Як вы ацэньваеце лінію кахання ў лёсе Яна Чачота? Памяць пра якую дзяўчыну саграvала душу паэта ў далёкай Сібіры?

Репозиторий БарГУ

14. Аўтарам якіх твораў на польскай мове з'яўляецца Ян Чачот? Якія тэмы цікавілі творцу найбольш?

15. Які лёс напаткаў Яна Чачота пасля разгрому тайных таварыстваў? Як паводзіў сябе філамат, знаходзячыся за турэмнымі кратамі?

16. Дзе адбываў катаргу Ян Чачот? Што давала яму сілы не адчайвацца ўдалечыні ад родных і сяброў?

17. Якія жыццёвыя перыпетыі чакалі пакутніка пасля вяртання ў Беларусь у 1833 г.?

## Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў

**Заданне 1.** Ян Чачот падрыхтаваў прамову «Думкі для ніжэйшага класа» да пасяджэння Таварыства філаматаў, якое адбылося 7 мая 1821 г., дзе абмяркоўвалася пытанне пра актывізацыю работы згуртавання.

Падвяргаючы крытыцы сучасны стан грамадства, філамат імкнецца растлумачыць з асветніцкіх пазіцый, хто такі грамадзянін. Якімі якасцямі, па разважаннях Яна Чачота, павінен валодаць сапраўдны грамадзянін? Які шлях павінна выбраць грамадства, каб кожны яго член быў шчаслівы? Ці прысутнічаюць у натуры айчыннага паэта задаткі эканаміста? Дакажыце.

### Думкі для ніжэйшага класа

1. Шчасце — гэта найвышэйшая мэта ўсіх імкненняў чалавека; шчасце — ва ўнутранай задаволенасці ад сваёй працы, учынкаў і побыту; асабістае шчасце — у шчасці грамадскім: дбаць пра грамадскае дабро — значыць памнажаць і дабро ўласнае.

2. Хто дбае пра грамадскае дабро, інакш кажучы пра шчасце, асвету і славу краю, хто рады прысвяціць яму самога, складаць яму ўсе здольнасці, сілы і маёмасць — з'яўляецца сапраўдным грамадзянінам.

3. Сапраўдны грамадзянін паводзіць сябе не толькі згодна ўстаноўленым грамадскім законам, але і згодна з законам сумлення, маралі і рэлігіі; улада законаў знаходзіць чалавека дома і па-за домам, але ўнутры чалавека няма моцнай спружыны для кіравання яго ўчынкамі; дык вось — там, дзе ўлада законаў і сораму слабыя, там пачынаецца ўлада сумлення і рэлігіі.

4. Рэлігія не толькі аб'ядноўвае людзей з творцам, яна не толькі ўцеха і вышэйшая асалода для сэрцаў, знясіленых пад цяжарам няшчасцяў і чалавечых заган, але і шчыт супраць варожых грамадству яго членаў, яна — краевугольны камень, на які абапіраецца мараль і тленнае шчасце.

Рэпазіторый БарГУ

5. Рэлігіі і маралі варожыя: абыякавасць да ўшанавання Бога, непавага да месцаў гэтага ўшанавання, распаўсюджванне поглядаў, якія падрываюць асновы рэлігіі, распуста і адступленне ад звычаяў, усялякага роду празмернасці.

6. Маральная распушчанасць, празмернасці і раскоша ў задавальненні жыццёвых патрэб, што прыводзяць да жудасных вынікаў, нараджаюць агіду да шлюбу, якая вельмі часта назіраецца сёння. Праз гэта псуюцца дарэшты не толькі пачціvасць, мараль, не толькі церпіць ад гэтага рэлігія, але, што вынікае адсюль, церпіць увесь люд, які ўсё больш прыкметна робіцца слабейшым, бяднейшым, становіцца няздатным, як трэба працаваць для дабра краю, а значыць, і для дабра кожнага паасобку.

7. Ашчаднасць з'яўляецца маткай выгоды, парадку і багацця, словам, дамашняга і грамадскага шчасця, з'яўляецца рысай сапраўднага грамадзяніна, бо яна вядзе да прыстойнага карыстання дастаткамі, з якімі трэба дзяліцца і з іншымі, яна працівіцца ўсякім празмернасцям і раскошы — самай галоўнай прычыне дэмаралізацыі. У нас, дзе празмернасці гэтыя не толькі не даюць карысці, не павялічваючы мясцовую прамысловасць, але выразна шкодзяць, бо гэта ж марнуюцца апошнія сродкі, якія можна было б укласці ў развіццё земляробства. Ашчаднасць вельмі пажаданая, яна той адзіны бальзам, што столькі можа загаіць ран і падмацаваць грамадскі дух.

8. Той, хто прысвячае сваю працу — фізічную ці разумовую — свайму краю, усё робіць для яго дабра, з'яўляецца адначасова карысным грамадству чалавекам і паважаным грамадзянінам. Адсюль вынікае, што гэтак жа, як да веравызнанняў, заўсёды павінна быць цярпімасць да працоўнага класа — рамеснікаў ці прадстаўнікоў любой іншай працы; трэба быць нецярпімым толькі да гультаёў, якіх мы павінны схіляць да працы.

9. Асвета краю — найважнейшая спружына яго шчасця. Асвета пашыраецца праз павелічэнне кола тых, хто ўмее чытаць; таму трэба засноўваць школы Ланкастэра, падтрымліваць навуковыя ўстановы, заахвочваць тых, хто пасылае дзяцей і моладзь у школы і ва ўніверсітэт, пашыраць чытанне і друкаванне карысных кніг, раздаваць іх у школах у якасці прэмій, дапамагаць тым, хто хоча вучыцца, падтрымліваць мастацтва, рамёствы, засноўваць і развіваць фабрыкі, асабліва паперні, суконныя і ткацкія фабрыкі, што найлягчэй можна ажыццявіць у краі.

10. Ва ўніверсітэце яшчэ вельмі многія без ніякіх вынікаў прысвячаюць сябе прыродазнаўчым і матэматычным навукам, у той час як так патрэбныя чыноўнікам і грамадзянам навукі права і адміністрацыі ляжаць у нас аблогай. Тых, што не маюць такіх здольнасцей, каб, працуючы над фізікай ці матэматыкай, маглі прынесці карысць навуцы і краю, і тых, што не прысвячаюць усё сваё жыццё гэтым навукам, а вывучаюць іх толькі для таго, каб набыць званне, трэба адгаворваць ад гэтага адзінага іх імкнення і схіляць да вывучэння права, палітычнай эканоміі, гісторыі, урэшце аграноміі, на якую, не пакідаючы ўпарта вывучаць свае прадметы, маюць найбольшае права і якой як жыхары аграрнага краю хутчэй за ўсё павінны сябе прысвячаць.

Репозиторий БарГУ

11. Залішне мяккае і камфортнае выхаванне з'яўляецца пачаткам распешчанасці, слабаволля і іншых заган, як фізічных, так і маральных, якія сярод нашай моладзі аж занадта часта назіраюцца. Трэба імкнуцца палепшыць дамашняе выхаванне, трэба, каб кожны развіваў свае фізічныя сілы, а для гэтага карысны: заняткі з палашом, конная язда, плаванне і іншыя практыкаванні.

12. Мала гаварыць пра станоўчыя якасці чалавека і вучыць ім; трэба самому даваць ва ўсім прыклад у паводзінах. Бо ніхто так не схіляе да ліхога людскія сэрцы і розум, як ліхія ўчынкі тых, хто воляй лёсу закліканы вучыць просты люд і паляпшаць разбэшчаны свет, хто на словах прапаведуе дабрачыннасць, а ў жыцці заграз у распуце.

**Заданне 2.** Прачытайце прадмову «Думкі, якія павінен пашыраць вышэйшы клас». Як носьбіт асветніцкай ідэалогіі, Ян Чачот верыць у магчымасць умацавання дабра толькі тады, калі паны будуць дбаць пра дабрабыт і асвету свайго народа. Якія пачуцці выклікаюць у філамата прадстаўнікі каталіцкай царквы? Чаму Ян Чачот абараняе масонаў, да якіх належаў дарэчы і ягоны сябра Тамаш Зан? Прачытайце артыкул «Тайныя таварыствы» (дадатак А) і вызначце задачы розных асветніцкіх і палітычных арганізацый.

Якім уяўляецца Яну Чачоту вайсковае саслоўе? Хто павінен несці ваенную службу?

З якіх пазіцый наш суайчыннік глядзіць на прыгон?

## Думкі, якія павінен пашыраць вышэйшы клас

1. Грамадскае шчасце залежыць як ад добрых грамадзян, так і ад добрага ўрада.

2. Не могуць быць добрымі грамадзяне там, дзе кепскі ўрад, і не можа быць кепскага ўрада там, дзе большасць — добрыя грамадзяне.

3. Найлепшы ўрад будзе там, дзе ўсё робіцца згодна з пажаданнем народа, а не з волі, капрызу і сілы аднаго.

4. Умацаванне добрых можа перамагчы любое ліха; супроць грамадскай думкі зброя і любая сіла — нішто.

5. Строгія спосабы ўціску грамадскай думкі не павінны аслабляць сэрца і схіляць да адрачэння перакананняў, а павінны павялічваць супраціўленне гэтаму ўціску, яшчэ больш умацоўваць перакананні, актывізаваць пошукі спосабаў, пры дапамозе якіх можна хавацца ад праследаванняў.

6. Масоны зусім не такія, за якіх імкнецца выдаваць іх фанатычная стараннасць. Ведалі яны патрэбу рэлігіі і ўрада і супроць іх не выступалі. Але калі б прагнулі хоць пазнаць, які ўрад лепшы, і калі б рабілі тое, што кожны

Рэпазіторый БарДУ

сапраўдны грамадзянін павінен рабіць, ужо і гэта гаварыла б пра іх добрыя якасці. З таго, што ў іх былі тайныя згуртаванні (з дазволу ўрада), не вынікае, што яны рабілі змовы супроць веры. У цяперашні час увайшло ў практыку ўсё самае лепшае і таіць як мага лепей, таму не трэба, як звычайна усюды робяць, папракаць каго-небудзь за гэта, кажучы: калі не было нічога ліхога, нашто ж тады таіцца? Намер быў прыцягваць людзей да ўсеагульнага братэрства і ўзаемадапамогі; няўжо ж гэта можа быць нечым кепскім у вачах рэлігіі і з пункту гледжання маралі? (Робіцца гэта каб хутчэй выхоўваць пачуццё таварыскасці.)

7. Рэлігія, якой так павольна паддаюцца простыя сэрцы, мае тое няшчасце, што вельмі часта з'яўляецца страшнай зброяй фанатызму і ўціску; пад яе маскай, з крыжам у адной руцэ і са зброяй у другой ідуць, аслепленыя чаканымі прыбыткамі, чалавеканенавіснікі, каб абдурваць і занявольваць легкаверных і цёмных мужыкоў.

8. Духоўніку, які лічыць, што, выйшаўшы за брамку, ён ужо аказваецца не на свеце, а выракшыся прыемнасцей быць мужам, бацькам, думае, што ён ужо не грамадзянін зямлі, а жыхар нейкага параднеб'я, адкуль можна кідаць кулі на разбэшчаны свет, на асвету, філасофію, трэба далікатна напомніць, што ён жыве на зямлі, што са светам сувязей не парваў, корміцца хлебам, які дае зямля і праца суайчыннікаў і што задача яго — не замахвацца на асвету і філасофію, не ведаючы, што яны такое, а пашыраць святло навук, каб не сляпых, а адукаваных схіляць хутчэй да чыстай маралі і рэлігіі. У той жа час трэба патроху выступаць супроць бясшлюбнасці духоўнікаў, якая з'яўляецца найгалоўнейшай прычынай непрыстойнасці, эгаізму і варожасці да свету.

9. Вайсковае саслоўе, хоць яно — няшчасце роду людскога і найболей псуе мараль, хоць яно прычыняецца да абязлюджвання краю, павінна ў першую чаргу папаўняцца разумнымі грамадзянамі, паколькі цяпер, як відаць, пераважвае іншыя саслоўі: ніякія змены ў ім не могуць адбыцца, пакуль яно будзе складацца з наёмнікаў; у войска, значыцца, трэба прывабліваць тых, хто сядзіць па дамах без работы і хто здатны да вайсковай службы, мае да яе ехільнасць.

10. Ні асвета краю, ні земляробства не можа больш хуткімі тэмпамі рухацца наперад, пакуль не будзе ліквідавана ганебная, замшэлая на працягу вякоў і абраслая забабонамі перашкода — няволя сялян, якая супярэчыць законам прыроды, цвярозаму розуму і нават чыстым эканамічным разлікам і выклікае сорам у сэрцах людзей...

11. Моладзь часта бывае неспакойная, бо запалена рэвалюцыйным духам, ці залішне гарачая: яна рада была б пазбавіць заможных іх багацця, яна лічыць, што далёка не ўсім трэба аддавацца навукам, яна сваімі паводзінамі правакуе праследаванне ўрада на сябе і грамадзян... Вельмі мала моладзі ідзе вучыцца ва ўніверсітэт: з універсітэцкай акругі, дзе налічваецца ў школах больш 20 тысяч, набываць вышэйшыя навукі прыязджае ледзьве 700 чалавек; там з ахвотаю і карысцю бяруцца вывучаць навукі, хоць менш здольным яны даюцца з цяжкасцю; больш заможная моладзь, дрэнна выхаваная пры дапамозе крыкаў бацькоў, аказаўшыся ў горадзе, лайдачыць і кладзе пляму на



Репозиторий БарГУ

ўніверсітэт; праследаванні ўлад зыходзяць не так ад тутэйшай моладзі, як хутчэй ад духу ўрада, які ўсюды адным і тым жа спосабам прыціскае моладзь, мяркуючы, што ў моладзі больш сіл і супраціўлення, чым сярод іншых грамадзян, а прыціскаючы моладзь, прыціскае асвету.

12. Сказанае аб неабходнасці падмацоўваць словы сваім прыкладам у адносінах да ніжэйшага класа і тут трэба захаваць. Дадам яшчэ важнае пажаданне, каб, пашыраючы вышэйпрыведзеныя думкі, звярталася большая ўвага на час, месца і спосаб іх распаўсюджвання, каб пераказ гэтых думак меў большы вынік і не прынёе шкоды таму, хто іх пераказвае, бо такое на цяперашні час вельмі лёгка можа здарыцца.

Репозиторий БарГУ

РАЗДЗЕЛ 2
# ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ПАЭЗІІ ЯНА ЧАЧОТА

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў

1. Дайце азначэнне паняццю «эстэтычны ідэал». Па якіх законах адлюстроўваецца рэчаіснасць у літаратуры?

2. У чым сутнасць эстэтычнага ідэалу паэзіі Яна Чачота? Якія хрысціянскія дабрачыннасці прапагандуе аўтар у вершах і баладах? Назавіце асноўныя хрысціянскія вобразы-сімвалы, які выкарыстоўвае паэт у сваёй творчасці.

3. Згадайце творы беларускамоўнай спадчыны аўтара.

## Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў

**Заданне 1.** Да якога жанру адносіцца верш? Якім настроем прасякнуты радкі, з чым гэта звязана? Якія сродкі мастацкай выразнасці выкарыстоўвае Ян Чачот для выкрыцця грамадскіх заган?

### Гэй, сябры, у гурт вясёлы!

Гэй, сябры, у гурт вясёлы!
Хай зайздросцяць нам анёлы:
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Лі у келіхі з размаху
Гэты дар іскрысты Баха!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць бацькі і маткі,
Нашы продкі і нашчадкі!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць для нас каханкі —
Неба самага пасланкі!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Шчасце нам яны прыносяць,
Аж да неба нас узносяць!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць сябры між намі,
Шчасце — разам быць сябрамі!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць шчасліва жонкі —
Маткі нашае старонкі!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць і мужыкі іх —
Гаспадарныя такія!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!



Репозиторий БарГУ

І паны хай пажываюць,
Што сялян не прыгнятаюць!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць сяляне — хлебам
Кормяць свет яны пад небам.
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць усе паэты,
Што, як зоры, свецяць свету.
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жыве й святар адданы,
Толькі прыкладны, не п’яны.

Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жыве і чын вялікі —
Не драпежны, як звер дзікі!
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жыве і люд вайсковы,
Што за край стаяць гатовы.
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!
Хай жывуць усе на свеце:
Мы — зямлі адзінай дзеці.
Будзем пець і гуляць,
Ні пра што ані дбаць!

**Заданне 2.** Верш «Гэй, малойцы!» стаў традыцыйнай песняй для філаматаў, своеасаблівым ланцужком, які злучаў змагароў за волю пачатку XIX ст. і яго канца. Матывы гэтага верша Яна Чачота пазней выкарыстаў выдатны беларускі паэт Францішак Багушэвіч у польскамоўным творы «Песня», у якім ёсць радкі:

Знаць Чачота ўсе павінны,
І пра Зана дабрачыннасць,
Пра Касцюшку, і Манюшку,
І пра песняроў.

Рукі ім падаўшы, знаю,
Зробім болей мы для краю,
Чымся ў бойках разам стойка
Праліваўшы кроў.

Які шлях вызвалення Радзімы бачыць лірычны герой? Як вы думаеце, што ўвасобіў паэт у вобразе залатога веку нашага краю?

На якім стылістычным прыёме пабудавана кампазіцыя дадзенага твора, з якой мэтай ён выкарыстаны?

**Гэй, малойцы!**

Гэй вы, хлопцы,
Гэй, малойцы,
Час за справу брацца —
Досыць з Бахам знацца!
Вам чало ўвянчае
Край, што так чакае
Вашых слаўных дзеяў:
Вы — яго надзея!

Гэй вы, хлопцы,
Гэй, малойцы!
Вам навукам, працы
Трэба ўсім аддацца!
Каб не змарнавалі
Час і не праспалі.
Ключ да шчасця — знаю —
Ў клопаце аб краю!

Репозиторий БарГУ

Гэй вы, хлопцы,
Гэй, малойцы!
Працы плён багаты
Вы нясіце ў хаты!
Па бацькоўскіх гонях —
Без адкладу, сёння! —
Сейце без прынукі
Вы святло навукі.
Гэй вы, хлопцы,
Гэй, малойцы!
Добрых цнот сябры,
З крыўдай змагары!

Кожны з нас айчыне
Паслужыць павінен,
Свету, добрым людзям —
Славу так здабудзем!
Гэй вы, хлопцы,
Гэй, малойцы!
Будзе той каханы,
Лаўрамі ўвянчаны,
Хто працуе ў поце,
Дбаючы аб цноце,
Каб вярнуць, браты,
Век нам залаты!

**Заданне 3.** З успамінаў філамата Ігната Дамейкі вядома, што маладыя людзі вельмі любілі дэкламаваць верш «Сон свой скінуў пан вясёлы...», дзе раскрываліся мары і спадзяванні літвінскай моладзі. Узгадайце, хто такі сармат. Чаму яго вяртанне такое жаданае? Якія вобразы-сімвалы прысутнічаюць у творы? Раскрыйце іх сэнс.

**Сон свой скінуў пан вясёлы...**

1

Сон свой скінуў пан вясёлы —
Красавік, ідзе праз сёлы
Абуджаць лясы і долы.
Алілуя, алілуя, алілуя.

2

Тут сябры ўсёй грамадою
Во сышліся пад гарою
Піць ды есці талакою.
Алілуя, алілуя, алілуя.

3

Але ўсё ж дарма іх лаюць,
Бы яны адно і знаюць,
Што лайдачаць ды гуляюць.
Алілуя, алілуя, алілуя.

4

Не, з іх кожны — працавіты,
Да людзей душой адкрыты,
Годны продкаў, самавіты.
Алілуя, алілуя, алілуя.

5

Шмат вучыцца ў іх ахвоты.
Пішуць штоквартал работы
І даюць штомесяц — злоты!
Алілуя, алілуя, алілуя.

6

Край свой — клопат іх адзіны,
Мара іх — ва ўсе часіны
Быць падпорай для Айчыны.
Алілуя, алілуя, алілуя.

Репозиторий БарГУ

7

Прыйдзе час, і ў промнях рання
З філарэцкага яднання
Продак наш — сармат — устане.
Алілуя, алілуя, алілуя.

8

Блісне тут жазло сармата,
Клікне край ён да булата —
Знойдзе ўсіх за здзек расплата.
Алілуя, алілуя, алілуя.

9

Не змагчы, сябры, нас ліху!
Адпачнём цяпер хоць крыху,
Малако п'ючы паціху.
Алілуя, алілуя, алілуя.

**Заданне 4.** Не аднойчы згадвае Ян Чачот вобраз залатога веку. З якім гістарычным перыядам у развіцці Беларусі звязвае паэт росквіт культуры і матэрыяльнага стану грамадства?

Якія фальклорныя матывы гучаць у вершы «Зноў вярнуць вякі нам тыя...»?

**Зноў вярнуць вякі нам тыя...**

1

Зноў вярнуць вякі б нам тыя,
Калі рэкамі ліліся
Малако, мяды густыя,
Людзі соладка жылі ўсе.
Сэрцы ў іх былі — бы з мёду,
Чысціні малочнай — душы.
Чорных дзей не знала зроду,
Смутак дум іх не цярушыў.

2

Не трубіў ніхто аб цноце,
Не ўважала цнота пыху.
Кожны шчыра, па ахвоце
Шырыў добрае паціху.
Не маніла продкаў хвала,
Пра свае не дбаў даброты,
А чыніў ён, што казала
Сэрца, поўнае шчадроты.

3

Зноў вярнуць вякі б нам тыя,
Калі рэкамі ліліся
Малако, мяды густыя,
Людзі соладка жылі ўсе.
Так мы некалі ўздыхалі
Па вяках тых пад вятрамі,
Аж пакуль усе не сталі
Філарэтамі, братамі.

4

Гэтак мы вярнулі сёння
Залаты свой век гурмою.
Дружбы велічнай бяздонне
Поіць сонцам нашу мрою.
Дружба гэта меж не знае,
У вякі яна прастуе.
Сэрцы нашы ўспалымняе,
Маладую моц гартуе.



Репозиторий БарГУ

5

Ты вярнуў вякі нам тыя,
Нас гукнуўшы звонка ў высі.
Малако, мяды густыя
Нам ракою паліліся.
Малако й ад нас прымі ты
Як знак веку залатога.
З ім і з мёдам у блакіты
Хай бяжыць твая дарога!

**Заданне 5.** Тамаш Зан, блізкі сябра Яна Чачота, разам з Адамам Міцкевічам, Юзафам Яжоўскім, Ануфрыем Петрашкевічам, Францішкам Малеўскім, Міхалам Рукевічам, Юзафам Кавалеўскім, Ігнатам Дамейкам і іншымі сябрамі-філаматамі рабілі ўсё, каб аб'яднаць беларускую моладзь для актыўнай грамадскай дзейнасці. Якая мэта гэтай дзейнасці?

Якім настроем прасякнуты радкі? Назавіце мастацкія вобразна-выяўленчыя сродкі, што ствараюць антытэзу ў вершы? Як гэта звязана з фальклорнай паэтыкай?

Да якога жанру належыць дадзены твор? Дакажыце.

**У дзень урачыстасці, якая спраўлялася для Тамаша Зана 29 мая 1821 г.**

Не трэба журыцца, о краю мой любы,
Што аддалі цябе дзеці на згубу.
Не трэба журыцца, што вораг, як хоча,
Прах продкаў славутых тваіх сёння топча,
А мы, іх забыўшы, ўсё болей і болей
Звыкаемся, сытыя, з нашай няволяй.
Не трэба тужыць... Новай славы праменне
Асвеціць яшчэ нашых прадзедаў цені —
Хай знаюць, што й сёння іх родныя нівы,
Дзе колісь паказвалі мужнасці дзівы,
Усё ж нараджаюць сыноў яшчэ годных...
Да дзеяў рыхтуемся высакародных
Мы сёння, дух будзячы ўсюды ў краіне —
Хоць цемра навокал, усё ж ён не згіне.
У цемры той бразгае ворага зброя,
Што дол акрапляе нявіннай крывёю.
Забойцы гвалтоўнай рукою крывавай
Тут пішуць сваё неаспрэчнае права,
У помач узяўшы людскую сляпоту,
Усе забабоны, старую цямноту.
Яны яшчэ больш цемру тут зацямняюць

Репозиторий БарГУ

Ды страхамі, жахамі ўсю запаўняюць.
Мы, моладзь, паходні асветы пагаслай
Наноў распаліўшы — гарыце ж найясна! —
Куткі ўсе і лёхі, дзе енкі глухія,
Асвецім, адкрыўшы пакуты людскія.
Сарвём усе маскі і сонца праменнем
Разгонім мы ноч пад нябесным скляпеннем,
Пакажам двурушніцтва страшныя здані,
Якім верыць люд усё не перастане,
Напужаны імі, абняты трывогай!
Ды знікнуць яны, як не стане ні ў кога
Тых прымхаў, развеюцца ў свеце, растануць —
Пужаць імі хіба дзяцей толькі стануць.
О брацці! Нам прышласць шчаслівая ззяе!
Яе перад намі Тамаш расхінае.
Ён першы, яе паказаўшы ясноты,
Павёў нас да славы дарогаю цноты.
Мы з ім палюбілі свой гурт і ў забавах
Задумалі разам вялікую справу.
Яму хочам шчыра найлепшае зычыць,
Ды слоў не стае, каб яго узвялічыць.
Мо пэндзлем ці долатам увекавечыць
Яго нам, каб нашу пашану пасведчыць?
Узносілі грэкі герояў вялікіх
Калісь на Алімп — ёсць і сёння іх лікі.
У нас жа адна Тамашу ўзнагарода:
Любоў нашых сэрцаў, адданасць і згода.
А гэта мацней, чым граніт які, знаю,
Яго, Тамаша, ўвекавечыць у краі.

Репозиторий БарГУ

Р А З Д З Е Л 3
# АСАБЛІВАСЦІ ПРАЯЎЛЕННЯ ЭСТЭТЫЧНАГА ІДЭАЛУ ЯНА ЧАЧОТА Ў МЕЖАХ СЕНТЫМЕНТАЛІЗМУ, РАМАНТЫЗМУ І РЭАЛІЗМУ

## Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў

1. У чым слушнасць падыходу да разгляду асаблівасцей паэзіі Яна Чачота з пазіцый выяўлення прыкмет мастацкіх напрамкаў — сентыменталізму, рамантызму і рэалізму?

2. Дайце характарыстыку сентыменталізму як мастацкаму метаду. У творчасці якіх паэтаў ён знайшоў адлюстраванне?

3. У якіх творах выяўляецца эстэтычны ідэал Чачота-сентыменталіста? Назавіце іх і дапоўніце сваімі прыкладамі.

4. Хто, на думку Яна Чачота, вінаваты ў цяжкім становішчы мужыка? Каму найчасцей адрасуе свае вершы паэт? Як гэта звязана з асветніцкай дзейнасцю аўтара?

5. З якой заганай у асяроддзі сялян праз мастацкае слова змагаецца Ян Чачот-асветнік?

6. Якую ролю, на думку паэта, адыгрывае жанчына? Назавіце вершы, прысвечаныя жанчынам? Чаму Ян Чачот так часта звяртаецца да вобраза жанчыны?

7. Тэма дзяцінства — адна з актуальных у творчасці Яна Чачота-сентыменталіста. Якія задачы ставіць паэт перад бацькамі сялянскіх хлопчыкаў і дзяўчынак?

8. Апішыце ідэальнага селяніна, які паўстае з паэтычных радкоў Яна Чачота.

9. Як вядома, сентыменталісты распрацавалі вобраз ідэальнага ўладара («Дон Карлас» Ф. Шылера). Якім ён павінен быць, на думку Яна Чачота, для беларускага мужыка?

10. Якія рысы сентыменталізму прысутнічаюць у цыкле вершаў Яна Чачота «Зосіны песні»?

11. У чым асаблівасці рамантызму як мастацкага метаду? Дайце характарыстыку рамантычнаму герою. Назавіце прыкметы славянскага рамантызму.

Рэпазіторый БарГУ

12. Які жанр з'яўляўся найбольш папулярным у творасці Яна Чачота-рамантыка?

13. Ахарактарызуйце героя Бекеша з аднайменнай балады. Якія заганныя рысы выкрывае паэт у дадзеным вобразе?

14. На думку польскага даследчыка С. Свіркі, асобныя матывы балады Яна Чачота «Бекеш» выкарыстаў у сваіх баладах «Свіцязянка» і «Рыбка» Адам Міцкевіч. Дакажыце гэта, праанaлізаваўшы дадзеныя творы.

15. Якія матывы гучаць у баладзе «Навагарадскі замак»? Раскрыйце чачотаўскі ідэал шляхціца.

16. Што стала асновай балады «Калдычэўскі шчупак»? Якія два сацыяльныя тыпы супрацьпаставіў паэт у дадзеным творы? Якія рысы характару чалавека імпануюць аўтару?

17. Вызначце пафас балады «Мышанка». У чым асаблівасць народнага погляду на каханне? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.

18. Якія два паданні ляглі ў аснову балады «Свіцязь» Яна Чачота? Як творча іх перапрацаваў сябра паэта Адам Міцкевіч?

19. Як вядома, Ян Чачот дапрацоўваў сваю баладу «Свіцязь», ён дапісаў да яе яшчэ невялікі ўступ, дзе, захапляючыся творамі Адама Міцкевіча, папракае яго за тое, што той шмат нафантазіраваў і занядбаў праўду фальклорных паданняў. Чаму наш пачынальнік так клапоціцца пра захаванне аўтэнтычнай асновы творча перапрацаваных народных сюжэтаў?

20. Дайце характарыстыку мастацкаму метаду рэалізму. Як вы растлумачыце вядомую формулу вышэйназванай з'явы, выведзеную Энгельсам: «Рэалізм прадугледжвае, акрамя праўдзівых дэталей, праўдзівы паказ тыповых характараў у тыповых абставінах»?

21. У якіх творах Яна Чачота выявіліся прыкметы рэалізму? Да якіх з'яў грамадскага жыцця аўтар ставіцца крытычна?

22. У якім творы Адама Міцкевіча прысутнічае вобраз злога пана з балады «Узногі»?

23. Знайдзіце і працытуйце ацэнкі сучасных беларускіх даследчыкаў аб ролі асобы і творчасці Яна Чачота ў беларускім літаратурным працэсе.

24. Напішыце эсэ пра Яна Чачота на тэму «Мой зямляк — Ян Чачот».

25. Выканайце тэст для выяўлення ўзроўню ведаў пра жыццёвы і творчы шлях Яна Чачота.

Рэпазиторий БарГУ

## Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў

**Заданне 1.** Верш «О ты край мой нешчаслівы» напісаны ў турэмным зняволенні — у камеры францішканскага манастыра ў Вільні, дзе паэт адбываў пакаранне разам з сябрамі па згуртаваннях моладзі.

Якім пафасам прасякнуты радкі твора?

Да якога жанру адносіцца дадзены верш?

Якія мастацка-эстэтычныя пазіцыі твора дазваляюць аднесці яго да рамантызму?

### О ты край мой нешчаслівы

О ты край мой нешчаслівы!
Дзе ж твае ўсе абаронцы?
Ці ўжо ўбачыць твае нівы
Шматчаканай волі сонца?

Вораг, глянь, грабе адкрыта
Дар найшчодры твайго поля,
Ад тваіх ахвяраў сыты,
Ён смяецца з нашай долі.

Цноты продкаў топча, памяць
Аб табе ён выдраць хоча
І за плач па волі пляміць
І карае нас ахвоча.

Робіць з нас ён братабойцаў,
Сее ў душах злосць зацята.
Ну ж і час: сын, бацьку бойся,
Бойся ўсюды, браце, брата!

О ты край мой нешчаслівы!
Дзе ж твае ўсе абаронцы?
Ці ўжо ўбачаць твае нівы
Шматчаканай волі сонца?

Калі ж дзецям, што ў прыгоне,
Шчасце-долю высняць маткі?
І калі выбранцаў скроні
Вы ўвянчаеце, дзяўчаткі?

**Заданне 2.** Верш быў напісаны на Урале і ўключаны ў цыкл «Зосіны песні», які 25 студзеня 1833 г. Ян Чачот пераслаў з Таржка Міхалу Верашчаку для перадачы ягонай сястры Марылі Путкамер, што мела сяброўства з каханай паэта Зосяй Малеўскай.

Ян Чачот у гады ссылкі ў сваёй паэзіі звяртаецца да вобразаў птушак. Назавіце творы дадзенага аўтара, дзе гэтыя вобразы прысутнічаюць. З паэтыкай якога мастацкага кірунку гэта звязана?

Сімвалам чаго выступае голуб?

Якому жанру лірыкі адпавядае гэты твор?

### Голуб

Я паслаў бы, голуб,
Цябе ў любы край,

Дзе маё каханне,
Дзе мой светлы май.

Репозиторий БарГУ

Мо б занёс праз далеч
Мілай колькі слоў:
Лейлі, ты мне люба,
Жыў я і здароў.
Я сказаў бы, голуб:
Мчыся ў добры час,
Між дзяўчат пазнаеш
Мілую ты ўраз.

Твар яе журлівы,
Хоць на вуснах — смех.
І сядзіць самотна
Між людскіх уцех.
Ты яе пазнаеш,
Бо яна — адна,
Самая з наймілых
Мілая яна.

Што яна — красуня,
Слова нават дам.
Ну, а ці сумуе...
Ты убачыш сам.

**Заданне 3.** Прааналізуйце прадмову Я. Чачота да збору песень. Якія адносіны аўтара да сялян, як яны праяўляюцца? Што сведчыць аб сентыменталісцкіх схільнасцях айчыннага фалькларыста?

### Прадмова да «Сялянскіх песень з-над Нёмана»

Нашы сяляне — люд добры, лагодны, працавіты, пачцівы, павінны абудзіць у нас найпрыхільнейшыя да сябе пачуцці. З імі мы можам быць шчаслівыя. Удзяляючы ім за працу іх рук працы нашага розуму і асветы, мы можам памножыць усеагульнае дабро. Не думайце, што мы не можам і ад іх чаму-небудзь навучыцца. Мы многаму навучымся з пазнання іх становішча і характару; знойдзем у іх паданні, казкі, былі, самае багатае будзе жніва песень, якія дадуць магчымасць пазнаць іх тонкія, прыгожыя, нават далікатныя і глыбокія пачуцці. Не думайце, што толькі кожны горад ці правінцыя маюць свайго вучонага спевака; мы ўбачым, што свайго невучонага, але душэўнага і сардэчнага спевака мае амаль кожная вёска. Я заўважаў, што на адлегласці колькі міль, нават паўмілі зусім розныя спяваюцца песні. Які гэта скарб для адукаванага спевака і даследчыка! Колькі там нязмушанай і свежай паэзіі! Слухаючы з ахвотай вясельныя, дажынкавыя, купальскія і іншыя песні, не раз будзем мы прыемна задаволеныя і, што яшчэ больш важна, набудзем большую прыхільнасць да нашых добрых земляробаў. Так цяжка мне ўспамінаць, як у нас дома (гэтаму я быў сведкам) з боязі пажару ад запаленых агнёў не дазвалялася святкаваць Купалу, як, не жадаючы прымаць у сваім маёнтку працавітых і мілых гасцей, што часам не ўмеюць як трэба спажываць божыя дары, паны раздавалі ім на дажынкі яду і пітво па хатах! Пры добрым з боку памешчыка ці прадстаўніка ўлады наглядзе гэтыя сапраўдныя вясковыя ўрачыстасці так бы ўзаемна яднали і прывязвалі і гэтых гаспадароў, што ва ўладзе, і тых, што прыносяць, нібы пчолы ў вулей, багаты плён!

Шчыра палюбіўшы з гадоў маленства нашых мілых і добрых сялян, я хачу даказаць тут ім сваю прыязнасць. Доказ гэты — пераклад і перайманне

Рэпазіторый БарГУ

сялянскіх песень, якія спяваюць над берагамі Нёмана, у аколіцах Беліцы. Не ўсюды я вельмі трымаўся арыгінала, некаторыя ж, аднак, перакладзены даслоўна; іншыя больш-менш блізка пададзены ў перакладзе. Сялянская і наша пісьмовая мова не вельмі паміж сабой і розняцца; часам засталіся цэлыя выразы, некаторыя часам, каб зрабіць асобныя сказы больш гладкімі альбо каб удакладніць думку я дазволіў сабе адступіць ад тэксту, але заўсёды галоўная думка заставалася такая ж...

У будучым, калі і збор песень павялічыцца, я выдам іх разам з тэкстам арыгінала. Які б я быў шчаслівы, калі б гэтыя песні былі скарыстаны ў нас на святкаванні Дажынак, Купалы і павялічылі тую ўзаемную прыхільнасць пана і селяніна, ад якой так многа залежыць!

**Заданне 4.** Прачытайце верш Я. Чачота, які, як сведчыць даследчыца беларускага сентыменталізму І. Бурдзялёва, з'яўляецца яркім прыкладам дадзенага мастацкага кірунку. Праз што гэта рэалізуецца?

### Вясковыя ўцехі

Вёска любая мая ты!
Часам сумна мне бывае,
Ды тваім праходжу полем —
Сум умомант той знікае.

Стрэну там дзяцей вясковых —
Хоць адзежка ў іх у латах,
Столькі шчырасці чысцюткай
Бачу ў мілых вачанятах!

— Як жывеш, пане Стафане?
Усміхаецца Сцяпанка.
Там — Алесь, а там — Віктося,
Што зардзелася, там — Янка.

Пасвяць свінак тут, авечак.
Гэты — з пужкаю гуляе,
Тая ўе вянок з валошак.
Той скацінку ў гурт збірае.

Там — Ганулька-гаспадынька
З Ізабэлкай каля пашы
Шчыра бульбіны збіраюць,
Што выкопвае Лукашык.

Іх, сяброў маіх маленькіх,
Бачыць рад я на палетках —
Змітрака, Марцінка,
Юрку, Даміцэлю і Пракседку.

Іх усіх вітаю шчыра,
Грушку ім даю ці яблык.
Хто раней паглядваў скоса
На мяне, цяпер — мой сябра.

Хай жа вас сам Бог гадуе,
Вам дае здароўе, шчасце,
Ад людзей пашану, ўвагу,
Зберагае ад напасці.

Падрастай, народ маленькі,
Гаспадынькі, аратаі.
Адарыць мне вас няма чым —
Шчырым сэрцам адараю.



Репозиторий БарГУ

**Заданне 5.** Ян Чачот актыўна распрацоўвае ў паэтычнай творчасці вобраз сялянскай дзяўчыны. Якім рысамі надзяляе аўтар маладую гаспадыньку?

З чым параўноўвае Ян Чачот цяжкую працу селяніна на зямлі?

Якія пачуцці авалодваюць лірычным героем, калі ён назірае за працай маладой сялянкі?

### Гаспадынька Франуся
### (7/19 красавіка 1842 г.)

Глянь у поле — там дзяўчынка з бараной танцуе.
Як у такт яна ступае, як канём кіруе!
Што ў яе за павароты! Што за гнуткасць стану!
На красу такую толькі б любавацца пану!
На мяне ёй сорам глянуць. Памажы ёй, Божа!
Ды і так у шчырай працы Бог ёй дапаможа.
На мяжу жаўрук спусціўся — хоць на паўхвілінкі
Не здалёк, а зблізку танец паглядзець дзяўчынкі.
Шкода толькі: знекуль вецер наляцеў халодны,
Ды і конь яе нядужы — доўга быў галодны.
Божа! Дай хоць добрых коней аратаям нашым.
Каб жылі яны, як людзі. Плёну полю, пашам.
Мілы танец, што чаруе вока ў час натхнёны,
Ды мілейшы той, што ўсім нам хлеб дае штодзённы.
Пасля танца, што між сценаў, — толькі пыл курыцца,
Па Франусіным жа танцы — збажына кусціцца.

**Заданне 6.** Ян Чачот у сваіх паэтычных радках паказвае розныя тыпы сялянскіх жанчын, сярод іх і вобраз карміцелькі, якая была амаль у кожнага панскага дзіцяці. Праз вобраз мамкі выкрывае пачварнасць прыгону, калі маладая маці мусіць пакінуць свайго сына і аддаваць сваю ласку і пяшчоту чужому дзіцяці.

Як рэалізавалася ў дадзеным вершы светаадчуванне Яна Чачота?

Прывядзіце прыклады з беларускай літаратуры з падобным сюжэтным ходам. Якую сэнсавую нагрузку ён адыгрывае ў вызначаных творах?

### Мамка

Сын радзіўся у танюткай
Гожай пані, станам гнуткай.

Ды марнее хлопчык — Божа!
Бо сынка карміць не можа.

— Хай карміць маё дзіцятка
Прыйдзе з хат якая матка.

За паслугу матку тую
Накармлю і апрану я.



Рэпазіторый БарДУ

На той кліч прыйшла да ганка
Маладзенькая сялянка:

Свой сынок з ражка піць будзе,
Панскі ж — ссаць яе тут грудзі.

Малако свой — п’е любое,
Панскі ж сын — яе, грудное.

Свой — дзень плача без матулі,
А яна — пяе тут «люлі».

Мамка родная штоночы
Спіць у ложку колькі хоча,

А пазычаная матка
Ноч люляе дзіцянятка.
Так цябе, панок, слабога
Да жыцця ўзняла, малога.

Каб не тая мамка з вёскі,
Ты б і свет не бачыў боскі.

Акрыяў, падрос. Каб сілы
Набіраў хутчэй ты ў жылы,

Для цябе пшанічку жала
«Мамка», булкі выпякала...

Пэўна, ты ўжо знаеш, блазан,
Што жыццём ёй абавязан.

Ці пра гэта ўсё забудзеш,
Калі важным панам будзеш?
О каб помнілі мы, зналі,
Чые рукі нас люлялі,

Бліжнім мо спрыяць бы ўмелі,
Сэрцам бы не ачарсцвелі!

Мо братоў з гнілых хацінак
Не ганялі б, як скаціну.

Плён іх працы б шанавалі,
Каласка б не растапталі.

Іх да сэрца б прытулілі
Ды навукам навучылі.

Помні: многія з тых хатак
Нам другіх давалі матак.

**Заданне 7.** У сваёй творчасці Ян Чачот рэалізуе канкрэтныя асветніцкія задачы — ён выхоўвае не толькі «мілых мужычкоў», але і іх паноў. Якія пачуцці ён хоча выклікаць у гаспадароў да сваіх падданых?

Дайце апісанне сярмягі як віда адзення селяніна, паразважайце над выразам «сярмяжнае жыццё».

**Сярмяга**

Пані пекная, што бачыць з-за карункаў гожых,
З-за брыльянтаў пераліўных свету ўжо не можаш,
Глянь на бедную сярмягу хоць адзіным вокам,
Як праходзіць ля карчмы дзе будзеш ненарокам.

Ды нашто шукаць карчмы той — зазірні ў фальварак,
Дзе падданыя сышліся адрабляць шарварак:
Больш пярэстага убрання хіба знойдзеш дзе ты —
Нібы ў стравусава пер’е твой мужык адзеты.



Репозиторий БарГУ

На сярмязе ўбогай лата ды на лаце — глянуць:
Дзіва дзіўнае — ну, нібы ў пер’і афрыканец!
Толькі шкода: сонца светлай Афрыкі багатай
Ад яго ляснога краю ўсё ж далекавата.

Без сярмяг, без кажухоў тут у мароз, у холад
Ці ж нам можна абысціся — ты стары ці молад.
Сорам, пані, адзявацца з гэтакай раскошай —
Муж хай лепей на сярмягі дасць сялянам грошай.

Хай падумае хоць трохі і аб іхняй долі,
Зарабіць самім сярмягі хай жа ім дазволіць.
О яснейшымі намнога сталі б твае шаты,
Каб цябе не атачалі, пані, тыя латы!

**Заданне 8.** У баладзе распавядаецца пра злога і сквапнага пана, які валодаў вёскай Узногі. Яна зараз знаходзіцца ў межах горада Баранавічы. Верагодна, ў дзяцінстве Ян Чачот і пачуў паданне пра здзекі над сялянамі іх узножынскага гаспадара. Ёсць меркаванне, што такі жорсткі памешчык сапраўды жыў ва Узногах.

Прыёмы якога мастацкага метаду выкарыстоўвае паэт, каб даць ацэнку тагачасным сацыяльным адносінам у грамадстве?

Ян Чачот першым у айчыннай літаратуры звярнуўся да экалагічнай тэматыкі. Дакажыце гэта прыкладам з твора.

Якую сістэму кіравання асуджае аўтар?

**Урывак з балады «Узногі»**

О панская сквапнасць! Во гэтакіх хіба
Паноў, як ва Ўзногах, вы не сустракалі?
Усе яны дрыжма дрыжаць, каб і грыба
У лесе сялянкі хаця б не паднялі.

Нікому сарваць не даюць там нічога,
Пакуль у мяхі сабе не нахапаюць.
Як быццам гароды лясныя, што Богам
Усім дараваны, яны засяваюць.

Пад стражу ўвесь лес узялі — так пільнуюць,
Людзей жа за свет шлюць па дрэва гнілое,
За ўсякі крадзеж селяніна лупцуюць
Ці выкуп дзяруць — што ім скажаш на тое!

Репозиторий БарГУ

А глуміцца ж пушча! Яўрэй унь ссякае
Яе без шкадобы — гай робіцца галам!
Дый вецер віхурны наставіць, бывае,
Тут з дрэў піраміду — павал за павалам.

Лес — гэта ж багацце: каму невядома?
Калі ў год каторы не ўродзіць на полі,
Лес будзе ратункам: не дасць анікому
Ад голаду згінуць ніколі.

Дый хай мужыка пан навучыць талкова,
Як лес шанаваць, памнажаць дрэва тое.
Тады мо й не будзе караць так сурова
Яго за палена любое.

Мужык, кажаш, меры ніякай не знае?
Арэх рве з ляшчыны няспелы, зялёны?
Ды толькі дабру хіба ж хто навучае
Праз кары ды праз забароны?

Зірніце на нівы суседняга краю —
З лазы вінаград скрозь звісае там нізка.
Ніхто ж не сарве яго, хоць не ў звычаі
Ганебны бізун там і блізка.

Надзелены лепшай натураю, можа,
Насельнікі іншай, не нашай краіны?
Ці ёсць мо — хто мне зразумець дапаможа?
Яшчэ тут якія прычыны?

Зямля ў нас ліхая? Нічога не родзіць?
Ці тут гультаі? Праца ў нас не ў пашане?
Чаму ж селянін наш, як старац той, ходзіць,
Калі там панамі — сяляне!

**Заданне 9.** У лірычным адступленні да балады «Мышанка» Ян Чачот паэтызуе сваё дзяцінства. Як вядома, дадзеная тэма была асноўнай у творчасці сентыменталістаў, бо дзіця найбольш блізкае да так званай «натуры», прыроды, якая закладвае ў асобе асновы здароўя і маралі.

Якому жанру лірыкі адпавядае дадзены твор?

Якія мастацка-вобразныя сродкі ўжывае паэт, каб выказаць сваю любоў да малой радзімы?



Репозиторий БарГУ

Як вы разумееце сэнс наступных радкоў: «Вучылі нас думаць, рака, твае хвалі і родных палеткаў абшары»?

**Урывак з балады «Мышанка»**

О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка!
Зноў снішся ты ў барве заранак.
Найпершая ў свеце мая ты каханка,
Мільгнуў тут жыцця майго ранак.

Мае ўсе тут гульні, блуканні, забавы,
Высочваў я рыбку тут днямі,
Траву нёс кароўкам, рваў кветкі, рухавы,
Тут «біўся» не раз з «казакамі».

У чыстым крышталі тваім тут, здзіўлёны,
Я бачыў тады пад вадою
Чародку альшын, бор, узгорак зялёны,
Сябе — і ўсё ўніз галавою.

Тут час пралятаў мой, нам, дзецям, з табою
Так міла было і цікава.
Як рады былі, калі крыгі вясною
Ішлі тут — за лаваю лава!

Тады, у маленстве, калі я, шчаслівы,
Ў твае углядаўся крышталі,
Не знаў, што ўжо ў сэрца — о час наш імклівы! —
Яны мне навечна запалі.

Сум, радасць — як воблакі, тут праплывалі,
Раіліся чыстыя мары.
Вучылі нас думаць, рака, твае хвалі
І родных палеткаў абшары.

З людзьмі жывучы, ад людзей о як многа
Бярэш ты і ў сэрца, і ў голаў,
Як і ад ракі той, ад гэтых разлогаў,
Ад жыта, што спее наўкола.

Я жыў той красою — у часе прымглёным,
Красе ўсёй, пачуццям высокім



Репозиторий БарГУ

Я толькі пасля пазнаходзіў імёны
У свеце шматфарбным, шырокім.

Не знаю, дзе буду, памру дзе, не знаю,
Ды ўдзячны зямлі я, дзе вырас,
Я ў думках лячу зноў да роднага краю,
Здалёк мне відаць яго вырыс.

Мышанка мая! За ўсе краскі, за тое,
Што жыў тут, табою прыгрэты,
За светлае ранне сваё залатое, —
Прымі ж ты вянок мой во гэты.

**Заданне 10.** Ян Чачот у баладзе «Свіцязь» займае асветніцкія пазіцыі. Пра гэта можна дакладна меркаваць з лірычнага адступлення. Ён гняўліва асуджае марнатраўства пануючага саслоўя.

Якія чалавечыя ўчынкі асуджае лірычны герой? Як гэта характарызуе яго?

**Урывак з балады «Свіцязь»**

25

Нікчэмнасць! Вяршыня раскошы:
Піць, есці — і больш анічога!
А браць у каго яму грошы —
Не важна: у д’ябла ці ў Бога.
Сумленне ў разлік не ўваходзіць:
Хіба ж яно шчасце дзе родзіць?

26

Ды хай хоць каханне кабеты,
Няхай з асалод асалода —
Як будзе ў дарозе да мэты
Жыццё хоць чыё перашкодай,
Чым звесці са свету другога,
Сябе лепей знішчы самога!

27

Але і сябе ўсё ж няможна:
Жыццё — гэта ўласнасць не наша,



Репозиторий БарГУ

Яго адымаць нам — бязбожна.
А той жа, хто мысліць іначай,
Той, хто за дукат забівае,
Як д’ябал, душы ён не мае.

28

Ужо, слухачы мае, бачу:
Не так я пачаў спеў свой троху —
Па хлопцу ніхто з вас не плача,
І д’яблам я вас не спалохаў.
А што ж за балада такая,
Што чортам каго не злякае!

29

Тут мушу я вам растлумачыць:
Быў добры я ў часе запеўкі,
Другое (прашу мне прабачыць) —
Баяўся: спужаюцца дзеўкі,
Бо неяк адна мне казала,
Што здань яе ў песні спужала.

30

Дык як быць тут з д’ябальскай зграяй?
Пужаць не хачу я нікога,
Жаданне я гэткае маю:
Наколькі мая будзе змога,
Усім мне давесці патрэбна,
Адно: забіваць — найганебна.

31

А трэцяе — ўласную ліру
Настройваю я, як жадаю.
Цяпер больш паважна я, шчыры, —
Вы хочаце? — тут заспяваю.
Усё, за пяро я ўжо ўзяўся —
Каб толькі ніхто не пужаўся!

Репозиторий БарГУ

**Заданне 11.** Ахарактарызуйце ідэал мужыка, які паўстае з творчасці Яна Чачота. З якім пачуццём Ян Чачот гаворыць пра селяніна?

Згадайце іншыя вершы, дзе паэт дае сваю канцэпцыю станоўчых паводзін селяніна.

Як то добра, калі мужык
Трэзвы, гаспадарны!
Для такога ў цэлым року
Жадын час не марны!
Снягі таюць, ён гародзіць
Кольмі, што зімою
І навазіў, і начасаў
Добраю пароюю.
Ёсць у яго і лучына,
І дроў многа клетак:
Будзе чым варыці кашу
Усё лета для дзетак.
Вясна блісне, ён гной возіць,
І арэ, і сее,
Косіць лугі, сенажаці,
Нім жыта даспее.
Хлеба мае і не ходзіць
Вясною на меркі,
Бо зімою ён не лыкаў
У карчме з кватэркі,
Леткам жонка і дзяўчаты
Жнуць жыта, ярыну,
А ён звозіць, а ён зносіць
Ўсё у хараміну.
Папар арэ і малоціць,
Зноў сее у полі;
І працуе, рад і весел
З мужыцкае долі.
Ніколі ён не шукае
У карчме вяселля,
І не ляжыць так, як хворы,
Ўвесь дзень для пахмелля.
Ён у святой у царкоўцы,
На таргу бывае;
Бога, пана, сваю хату
І работу знае.
А захоча пагуляці,
У дом спросіць госці;
Тады сабе чарку водкі
Вып’е да вашмосці.

**Заданне 12.** У вершах, напісаных па-беларуску, Ян Чачот дбаў пра маральнасць простага чалавека. Грамадзянская неабыякавасць да сялянства абумоўлівала ў нечым маралізатарскі тон вершаў.

Якую сацыяльную загану асуджае паэт? Чаму ён звяртаецца да жанчын, каб яны выяўлялі непакой і клопат пра сваіх гаспадароў, былі неабыякавымі, актыўнымі ў знішчэнні п’янства?

***

Выведзьце, жаночкі,
З карчмы мужыкоў;
Вазьміце за рукаў,
Скажыце: дамоў!
Дзеткі без хлеба
Плачуць і крычаць;
Волікі гукаюць
Авечкі мычаць.
Конік пад карчмою
Ўвесь дзень стаіць;
Ніхто яму не даў
Ані есць, ні піць.
Ты адзін міленькі
Ўсё ў карчме прапіў;
Жонку, і дзетачкі,
І хату забыў!

Репозиторий БарГУ

**Заданне 13.** Ян Чачот адзін з першых уводзіў ў свае вершы ідэі класавага салідарызму. Як гэта праяўлялася? Якую асноўную задачу ставіць паэт перад панамі?

***

Паночкі, нашы кветачкі,
Вучыце нас, свае дзетачкі,
Як мы маем лепей жыці,
На вас, на сябе рабіці.

Цёмны мы, цёмны мужычкі,
Невучоныя прастачкі;
Вы нам ад Бога даныя,
Штоб вучылі падданыя.

Вучыце ж вы нас шчырэнька,
Будзе нам усім дабрэнька.
Бог там заўшэ шчасце дае,
Гдзе чалавека чалавек кахае.

**Заданне 13.** Растлумачце, чаму Ян Чачот звяртаецца ў вершах, адрасаваных сялянам, да хрысціянскіх дабрачыннасцей? Якую з іх культывуе паэт у дадзеным вершы? З кім асацыіруецца ў вас лірычны герой твора? Якія прыёмы паэтычнага сінтаксісу запазычыў аўтар з песеннай народнай творчасці?

***

Не на тое Бог стварыў,
Каб ты толькі еў і піў,
Але штобы працаваў,
Баранаваў і араў.
Ў поле, ў поле, дзетанькі,
Ў поле, ў поле, дзеванькі!

Поле хлеба нам нясе,
Поле здароўе дае;
Каб ты ў полі не рабіў,
Не еў бы ты, ані піў.
Ў поле, ў поле, дзетанькі,
Ў поле, ў поле, дзеванькі!

Будзь здарова, жонанька,
Ўзышло міла соненька,
Годзе, дзеткі, годзе спаць,
Трэба араць, сеяць, жаць.
Ў поле, ў поле, дзетанькі,
Ў поле, ў поле дзеванькі!

**Заданне 14.** Якія прыёмы сатырычнага выкарыстоўвае аўтар, каб выкрыць і выкараніць п’янства ў сялянскім асяроддзі? Напішыце водгук на дадзены верш.

***

Ай ей, які ён добры гаспадар!
Восень ужо прыйшла, не ворат папар;
А ён у карчме сядзіць,
Упіўся, на лаўцы спіць.

Репозиторий БарГУ

Ай ей, які ён добры гаспадар!
Дома, на дварэ крык, і плач, і свар;
А ён з паленам у руцэ
Таго, сяго глуміць, б’е.

Ай ей, які ён добры гаспадар!
Да карчмы занёс увесь божы дар;
А у хаце голад, ліха,
Толькі як пашоў, то ціха.

**Заданне 15.** Як прадстаўлена ў творы Яна Чачота сялянскае жыццё ў першай палове XIX ст.? Чаму, на думку паэта, простаму чалавеку патрэбен наглядчык? Што складае асноўны пафас паэзіі Яна Чачота пасля вяртання з ссылкі?

***

Працуйма, дзеткі, шчыра
У дому чы ў дварэ;
Не спіць чалавек добры
Пры рабоце нігдзе.

Нашто той прыганяты
З бізуном там стаіць?
Што Грышка пры рабоце,
Альбо Агатка спіць.

А Грышку і Агаце
Досыць Бог сілы даў,
Штоб тая не гультайка,
Той шчыра працаваў.

Ды яны ж не працуюць,
На іх карбач нясён;
А возьме ім уколей
Ганула і Сымон.

За іх няма нам долі,
За іх знаем бізун;
Не верыць пан і пані,
Стаіць войт і цівун.

Пашоў бы прыганяты
З намі разам араць,
Штоб толька пры рабоце
Грышэнька адвык спаць.

Працуйма ж, дзеткі, шчыра
У дому чы ў дварэ;
Не спіць чалавек добры
Пры рабоце нігдзе.

**Заданне 16.** Апішыце партрэт лірычнага героя дадзенага верша. Якія мастацкія сродкі выбірае паэт, каб раскрыць пачуцці лірычнага героя? У чым бачыць аўтар сэнс шчасця простага чалавека?

***

А мая ж ты кветачка,
А мая ж ты птушачка,
А мая ты зоранька,
А мая ты дзеванька,
Што ж мне, беднаму, рабіць,
Штоб з табою век свой жыць?

Калі будзеш гараваць,
Айца, матку шанаваць,
У свята да цэрквы хадзіць,
Па карчомках не блудзіць,
Мяне верненька любіць,
Век свой будзем разам жыць.

Репозиторий БарГУ

**Заданне 17.** Ці звярнулі вы ўвагу на багацце інтанацыі ў дадзеным творы? Падрыхтуйце выразнае чытанне верша. Як падае аўтар вобраз дваровай дзяўчыны? Чаму ў сялянскім асяроддзі не паважалі тых, хто жыве пры двары паноў?

***

Каб цябе спаліла маланка,
Чаму не хочаш Сцяпанка?
Ці ён цябе не кахае,
Ці ён розуму не мае?

Дык што ж, што ён мяне кахае,
Калі ён грошы не мае?
Калі ён не мае грошы
І сам не вельмі харошы?

Каб цябе спаліла маланка,
Што грош любіш, не Сцяпанка!
Недарма дворскі хлеб ела,
Паняю быць захацела!

**Заданне 18.** Хто выступае лірычным героем дадзенага твора? Каму адрасаваны гэты верш Яна Чачота? Які фальклорны вобраз выкарыстоўвае паэт, каб даць ацэнку «паночку»? Што ў першай палове XIX ст.з'яўляецца характэрным у адносінах заможных людзей да сялян і зямлі?

***

Ой, чаму ж ты, зязюлечка,
Свайго гнязда не ўеш,
Ды ў чужое гняздзечка
Дзеткі свае кладзеш?

Пакуль малая птушачка
Выкарміць іх — умрэ!
І сваім дробным дзетачкам
Корму не прынясе.

Чаму ты свайго, паночку,
Дому не збудуеш,
Ды чужы дом і вёсачку
Сабе аляндуеш?

І толькі два ці тры годы
Пабыўшы з намі тут,
Вязеш малыя дзетачкі
У другі чужы кут.

Каб ты лет дваццаць ці трыццаць
З намі разам пажыў,
Мы б цябе больш любілі
І ты б нас больш любіў.

Мы бы да цябе прывыклі,
Ты б нас, грунт наш пазнаў,
Ды як у сваім гняздзечку
Дзетачкі гадаваў.

**Заданне 19.** Прааналізуйце дадзены верш і скажыце, хто, на думку Яна Чачота, вінаваты ў цяжкім сацыяльным становішчы селяніна. Якія рысы пісьменніка-сетыменталіста праявіліся ў дадзеным творы?

Репозиторий БарГУ

***

Покуль сонца ўзыдзе,
Раса выесць вочы;
Кепска, як аконам
Лаяць, біць ахвочы.
Пан, ты наш пане!
Будзь жа нам ласкавы,

Не дай аканома,
Што адсцёбаць жвавы;
Хто мужыкоў глуміць,
Надвае варожыць:
Грош пану ў кішэню,
А два сабе ўложыць.

**Заданне 20.** Як вы лічыце, якому жанру рэлігійнай літаратуры адпавядае наступны верш Яна Чачота? Дайце ацэнку абагульненаму герою твора. Чаму, на вашу думку, паэт не вылучае сябе з сялянскай грамады? Што можна сказаць аб асаблівасцях менталітэту нашых продкаў, зыходзячы з паэтычных зваротаў, якімі пачынаецца верш?

***

Поле, поле шырокае,
Неба, неба глыбокае!
Божа, ты наш вечны пане!
Прымі ад нас павітанне!

Уся зямля слонцам ззяе,
З ясным небам размаўляе,
Што ўсё гэта тваім дарам,
Што ты света гаспадарам.

З ясным небам і зямлёю,
Чолам мы перад табою!
З чыстым сэрцам і душою,
Чолам мы перад табою!

Благаславі твае дзеткі,
Працу нашу і палеткі,
Благаславі усе людзі,
Няхай усім добра будзе!

**Заданне 21.** Прачытайце ліст з Варшавы Яна Чачота да Адама Міцкевіча. Паразважайце над эпісталярным стылем аўтара пісьма, вызначыўшы асноўны мастацкі прыём, які дапамагае раскрыць адносіны Яна Чачота да сітуацыі, што склалася ў асяроддзі чытаючай варшаўскай інтэлігенцыі і навуковых колаў. Пра якія літаратурныя прыярытэты нашага земляка сведчаць пошукі кніг Гётэ і Шылера? Якія літаратурныя творы слынных немцаў мог чытаць Ян Чачот? Як ацэньвае паэт грамадскую сітуацыю ў Варшаве? Што найбольш агіднае для патрыятычна настроенага ліцвіна?

Репозиторий БарГУ

## ДА АДАМА МІЦКЕВІЧА

*17(29) лістапада 1821, Варшава*

Ян Адаму здароўя і добрага настрою!

Лётаючы па Варшаве ў пошуках Гёца, падраў свае боты, але нідзе яго асобна не мог знайсці. Ну ж і ўбогія тут кнігарні, у якіх хіба толькі раманаў безліч. Самае чытэльнае тут — раманы. Чытаюць іх дамы і чыноўнікі для адпачынку пасля цяжкай працы на кухні і на службе. Нямецкіх кніг тут, можна сказаць, зусім не ведаюць, бо не любяць. Пфаф і Вэнцкі зусім іх не трымаюць, Глюксберг толькі пахваліўся кнігамі Гётэ і Шылера, ды і то па адным экземпляры. Разрываць гэтыя экземпляры ён не можа, а значыць, і Гётэ як бы і не было на тутэйшым свеце. Прывязу вам каталогі кніг — пабачыце, якія тут літаратурныя багацці! О, намнога болей тут цукерак і цацак, чым гэтых цвёрдым ілбом падрыхтаваных гасцінцаў!

Усё тут кепска, усё тут будзе не даспадобы чалавеку, які не жыватом, а розумам глядзіць на тое, што дзеецца. Есці, піць, адзявацца, шпацыраваць, сваволіць, не ведаю, ці і ў Парыжы лепей можна. Але жыць свабодна, бачыць і чуць, што пачціваe сэрца можа ўзрадаваць, не ведаю, дзе больш цяжка.

Здаецца, нідзе больш не могуць людзі жыць так, як тут — для жывата і сябе. Міністры тут як бы для таго пастаўлены, каб прымаць падрады, браць з-за мяжы непатрэбныя краю, але за яго кошт, прадметы раскошы; магнаты, каб як мага даражэй прадаваць краю свае палацы, замяняюць свае маёнткі на дзяржаўныя. Словам, усе імкнуцца тут да таго, каб ухапіць у свае хцівыя кіпцюры ці то грамадскае дабро, ці чый-небудзь прыватны набытак, усе рвуць, махлююць, крадуць. У гэтым мастацтве палякі даганяюць ужо рускіх, а можа, са сваімі настаўнікамі і зраўняліся. Усё тут занята сабою, усё тоне ў роскашы, не помніць, што робіць. Здаецца, людзі гэтыя ў нейкай гарачцы: трызняць, смяюцца, рвуцца без сіл, як хворыя, адпіхваючы ўсякія лекі. Ой, калі б яны ведалі, якая небяспечная іх хвароба!

Быў я тут на пасяджэнні Таварыства прыхільнікаў навук — важная эпахальная падзея, якая ў год два толькі разы на гарызонце паказваецца! І тут безгустоўнасць, і тут прысутнасць аднаго толькі Нямцэвіча мяне цешыць. Сташыц, наймудрэйшы з варшавян, выпальвае якуюсь прэлюдыю, у якой паведамляе, што будзе чытацца на пасяджэнні, даводзіць, як доўга і старанна над гэтым члены працавалі, паведамляе таксама аб смерці членаў, выклікае цень Патоцкага; потым лічыць падараваныя Таварыству нешматлікія кнігі. Садзіцца ціха, але як Хадані, і хутчэй, чым Хадані, бо моршчыць лоб і вылупліваe вочы. Пачынаецца навуковае паведамленне доктара Арнольда пра шчодрасць польскіх паноў у дачыненні да лекараў. Узлез на грушку, сарваў пятрушку — ах, мая салодкая цыбулька! Вярзе суцэльную бязглуздзіцу — аніякага не ўбачыў я там сэнсу; лепей бы ён зрабіў, каб

Репозиторий БарГУ

паведаміў, па колькі дактары бяруць за візіт, чым так бесталкова балбатаць. Гэта ж каб такое глупства, такое глупства — проста нельга выказаць!.. Далей нёс нудоту Скараход Маеўскі, даследчык славян, і потым здзівіў займальным расказам пра невядомага ў польскай гісторыі караля Самоса, які жыў яшчэ да Кракуса, Ванды; выдабыты аж з 3-га стагоддзя, знайшоў свайго гісторыка, які з такой пэўнасцю падаў яго дзеі, з якой мы не асмельваемся гаварыць пра Мечыславаў ці Баляславаў. Пасадзіў таго Самоса ў Замосці, горадзе, які быццам бы некалі быў яго сталіцай і меў назву — Самосць. О глыбакадумныя даследчыкі казкі, колькі гэта вы з’ядаеце хлеба, пакуль з казкі не зробіце казку!

Быў на красамоўнай лекцыі Асінскага. Мой божа, як жа мне ўсё тут надакучыла! Не вялікі ж я знаўца, чаму ж мяне хоць чым-небудзь не ашаломяць! Чытаў ён слова ў слова працу пра казку, якая існавала да Нямцэвіча, дэкламаваў некалькі казак Красіцкага і Нямцэвіча. Паслухаўшы гэтую вельмі звычайную лекцыю, я назваў бы яго хутчэй лектарам, чым прафесарам... Блішча чужою, здабытай стагоддзямі славаю, умее забаўляць кампанію, фліртаваць з кабетамі, а значыць, ён найвялікшы з аўтараў, найвялікшы з прафесараў, ды, калі казаць папраўдзе, ён проста найлепшы прыдворны. Такія людзі тут маюць найбольшую цану. І пастаў дзесяць Ляляевеляў, дык, пэўна, за аднаго Асінскага не сыдуць. Такая думка нават у вучня тутэйшага універсітэта, былога настаўніка ў Петракове.

На ніякіх іншых лекцыях яшчэ не бываў, толькі збіраюся іх наведаць, асабліва лекцыі права. Бібліятэк, кабінетаў, апрача прыродазнаўства, яшчэ не наведаў. Наведаю з Францішкам, які прыехаў сюды ў мінулы панядзелак (а цяпер чацвер). Навучанне, як вядома, кепска тут ідзе. Любяць навукі з-за іх вядомага бляску і славы, але не для справы; зусім не любяць працы, а імкнуцца да выгод жыцця, раскошы, раскошы, а значыць, да гультайства. Не дай Бог: было ў Польшчы бязладдзе і цяпер нялад. Бадай бы ліха ўзяло той Парыж, што ён цэламу свету служыць за мадэль, а Варшава мае гонар быць яго вельмі блізкай копіяй.

Кароткі дзень і слота не дазваляюць мне добра правесці час. Нічога тут асаблівага я яшчэ не бачыў. Сяджу болей дома, бываю часам у тэатры. Тут ёсць балет і камедыя; выйду адсюль, як са школы Піфагора, і лепей выйсці, чым выседжваць тут, нібы ў каталажцы. Ценю ўжо тут не пужаюцца, усюды асцярожненька маўчаць; так далёка сягнула тут канстытуцыйная вольнасць.

Рэпазіторый БарДУ

## АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ТЭСТ

### Частка А

*Выберыце правільныя адказы.*

А1. Гады жыцця Яна Чачота:
а) 1812—1891; б) 1876—1916; в) 1731—1826; г) 1796—1847; д) 1807—1884.

А2. Кірункі рэалізацыі Яна Чачота як творчай асобы:
а) палітычны і царкоўны дзеяч; б) пісьменнік; в) драматург; г) фалькларыст; д ) лінгвіст; е) перакладчык; ж) публіцыст.

А3. Месца нараджэння Яна Чачота:
а) фальварак Панюшкавічы Бабруйскага павета; б) вёска Кублічы Лепельскага павета; в) вёска Занкі Ваўкавыскага павета Гродзенскага ваяводства; г) Малюшычы Наваградскага павета; д) фальварак Парышава на Міншчыне.

А4. Месца вучобы Яна Чачота:
а) Кракаўскі ўніверсітэт; б) Горы-Горацкая акадэмія; в) Віленскі ўніверсітэт; г) Мінскі калегіум; д) Наваградская дамініканская школа.

А5. Творы, напісаныя Янам Чачотам:
а) «Дзяды»; б) «Бекеш»; в) «Мемуары скарбніка»; г) «Славяне ў XIX стагоддзі»; д) «Мышанка»; е) «Узногі».

А6. Ян Чачот адбываў ссылку:
а) у крэпасці Кізіл; б) у Казані; в) ва Уфе; г) у Мінску; д) у Арэнбургу.

А7. Год вяртання Яна Чачота ў Беларусь:
а) 1824; б) 1833; в) 1830; г) 1847; д) 2013.

А8. Пасля ссылкі Ян Чачот працуе:
а) у Масе Радзівілаўскай у Вільні; б) аканомам у маёнтку Рэпіхава Навамышскай парафіі; в) у Лепелі ў дырэкцыі Бярэзінскага канала; г) у Мінску; д) на пасадзе бібліятэкара у графа Храптовіча ў Шчорсах.

Репозиторий БарГУ

А9. Пахаваны Ян Чачот:

а) у Вільні; б) у Новай Мышы; в) у Шчорсах; г) у вёсцы Ротніца каля Друскенікаў; д) у Мінску.

## Частка Б

*Дапоўніце сказы.*

Б1. Радкі Яна Чачота

«І вашыя душы, як гэтыя дрэвы,
Належаць мне толькі па праву.
Каб зналі: не будзеце слухаць мяне вы —
Знайду на вас хутка я ўправу!»

узяты з твора ______________________________________________.

Б2. Сюжэт балады Яна Чачота «Мышанка» ўзяты з _____________.

Б3. Словы

«Сям'я ў мяне, дзеці... І будуць сіроты,
Жыць з марай адною — аб хлебе?
Ах, Бога пабойся, калі няма цноты!
Запомні, суддзя ёсць на небе!
Калі галаву маю здымеш ты сёння
Дык ведай жа: знойдуцца сілы,
І ў часе сваім яна дошку адслоне,
І з помстою выйдзе з магілы!»

належаць герою паэмы «Свіцязь» Яна Чачота __________________.

Б4. Уласнымі сялянскімі песнямі Яна Чачота з'яўляюцца ________ ____________________________________________________________.

Б5. Шэсць зборнікаў беларускіх народных песень выдаў Ян Чачот пад назваю ____________________________________________________.

Б6. Задуму расказаць у паэтычных радках пра мінулае роднай Беларусі, пра часы Вялікага княства Літоўскага Ян Чачот здзейсніў у цыкле ______________________________________________________.



Репозиторий БарГУ

ДАДАТАК А
*(абавязковы)*

## ТАЙНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ[1]

У пасляваенны час (напалеонаўскія войны XIX ст.) грамадска-палітычная думка беларуска-літоўскіх губерняў па-рознаму ставілася да аднаўлення Польшчы. На думку П. Баброўскага, «пасля Венскага кангрэса ў заходніх губернях стварылася малавядомая партыя, меўшая на чале некаторых прафесараў Віленскага ўніверсітэта, якія ахвотна жадалі б аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага, а не злучэння Літвы і Валыні з былой Каронай». Значная частка грамадства ўсё ж працягвала падтрымліваць ідэю аднаўлення Польшчы ў межах да 1772 г., што знаходзіла адлюстраванне ў дзейнасці тайных таварыстваў.

Літаратуру, гістарычныя творы, мастацтва, таксама як жыццё канца XVIII — пачатку XIX ст., укрывала рамантычнае покрыва таямнічасці, неадназначнасці, містыкі, рэлігійнага экстазу, бунту адзіночкі. Магчыма, найбольш выразна дух таго часу праяўляўся ў дзейнасці масонскіх ложаў. Цікавы той факт, што ініцыятары і распрацоўшчыкі канстытуцыі ад 3 мая 1791 г. былі не толькі сябрамі масонскіх суполак, але некаторыя і ўзначальвалі іх. Напрыклад, І. Патоцкі. С. П'ятолі, К. Сапега (вялікі магістр), М. Агінскі (намеснік вялікага магістра). 72 паслы (22%) Чатырохгадовага сейма (з 359 абраных) былі масонамі. Больш за тое, ідэя стварэння ўнітарнай дзяржавы, ліквідацыі аўтаноміі ВКЛ была зафіксавана ў статуце масонства Польскага каралеўства і ВКЛ яшчэ ў 1784 г.

Пасля ўтварэння Царства (Каралеўства) Польскага пад суверэнітэтам расійскага імператара працэс стварэння масонскіх суполак значна паскорыўся. Шляхецкае асяроддзе было незадаволена, але яно палічыла, што стварэнне Царства — гэта рэальны шанс дамагчыся незалежнасці. Тым больш што, нягледзячы на вайсковую службу ў дзеючай арміі Напалеона, польская шляхта была залічана ў войска новага польскага Царства. Каб мець магчымасць збірацца, не выклікаючы падазрэння ўлад, былі выкарыстаны масонскія ложы. Таму 1816—1819 гг. і атрымалі назву «залатога веку масонства». Масонскія ложы і блізкія ім па структуры арганізацыі не былі раўназначным. Масоны сталі фундаментам для ўсялякай тайнай дзейнасці,

[1] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 2011. Кн. 1. С. 212—2015.



Репозиторий БарГУ

без ведаў пра іх нельга зразумець ні пачаткаў арганізацыі філаматаў, ні сутнасці кантактаў паміж літвінамі і расійскімі дзекабрыстамі.

Пад уплывам еўрапейскіх і расійскіх масонаў у Польшчы і на беларуска-літоўскіх губернях таксама ствараліся тайныя арганізацыі, мэтай якіх было абуджэнне нацыянальнага духу і планаванне ваенных дзеянняў з Расіяй. Да такіх арганізацый адносілася, напрыклад, «Патрыятычнае таварыства» ў Польшчы. У Літве ў 1817 г. былі створаны таварыства шубраўцаў (1817 г.); філаматаў (1817 г.), філарэтаў (1820 г.), прамяністых (1820 г.), прыяцельскі саюз (1819 г.), таварыства паэтаў (1823 г.). «Таварыствам шубраўцаў» кіраваў доктар філасофіі і медыцыны Я. Шымкевіч з ложы «Стараннага літвіна». На іншыя таварыствы аказваў уплыў К. Кантрым, памочнік Я. Шымкевіча, які быў добра знаёмы з Т. Занам. Названыя таварыствы дзейнічалі са згоды ўніверсітэцкіх улад. Яны садзейнічалі з'яўленню тайных таварыстваў на Літве (Коўна, Кейданы, Свіслач, Полацк і інш.). У 1815—1821 гг. існавалі ложы ў Мінску, Нясвіжы, Гродне, Навагрудку, Слуцку. У іх налічвалася каля 1 063 братоў. З 1818 па 1821 г. у Мінскай губерні налічвалася 5 масонскіх ложаў, у склад якіх уваходзіла каля 800 чалавек. Пры гэтым 50% членаў ложа ў Мінскай губерні складалі памешчыкі, каля 20% — судовыя чыноўнікі, як былыя, так і дзеючыя, і каля 30% — прадстаўнікі творчай шляхецкай інтэлігенцыі і інш. Агульным дэвізам ложаў быў заклік «Роўнасць і незалежнасць!».

Гэтыя таварыствы спачатку сваёй мэтай ставілі задачы маральнага ўдасканалення, стварэнне самадапамогі, вывучэнне польскай гісторыі, мовы, літаратуры, але далей на тайных пасяджэннях сталі абмяркоўвацца пытанні незалежнасці Айчыны. Напрыклад, афіцыйная мэта дзейнасці філаматаў была вызначана наступным чынам: «узаемная дапамога ў нястачы, у набыцці ведаў і замацаванні ў духоўнасці». Філарэт жа І. Яноўскі на следстве паказаў, што, акрамя набыцця навуковых ведаў, галоўная мэта таварыства філарэтаў была ў злучэнні агульных сіл для аднаўлення Польшчы «ў былым яе бляску»

Сярод сяброў дзекабрысцкіх тайных арганізацый, якія дзейнічалі ў Расіі, «польскае пытанне» выклікала вострую рэакцыю, асабліва абяцанні Аляксандра I вярнуць палякам землі, якія былі далучаны да Расіі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Так, у створаным у 1816 г. «Саюзе выратавання» (членамі якога былі М. і А. Мураўёвы, С. Трубяцкой, П. Пестэль і інш.) палічылі гэтыя выказванні за непавагу з боку імператара да нацыянальнага гонару Расіі і яе дзяржаўных інтарэсаў. Тэрытарыяльнае пытанне ставілася і пры перамовах у пачатку 1820-х гадоў паміж дзекабрыстамі і польскім «Патрыятычным таварыствам». Так, вясной 1824 г. П. Пестэль інфармаваў у Пецярбургу кіраўнікоў «Паўночнага таварыства» аб выніках перамоў па пытаннях, звязаных з прызнаннем незалежнасці Польшчы і далучэння да яе польскіх губерняў, акрамя Беларусі. Такая інфармацыя выклікала незадаволенасць з боку кіраўнікоў таварыства, якія лічылі далучаныя землі



Репозиторий БарГУ

«старажытнай уласнасцю нашай». Праціўнікам адарвання ад Расіі на карысць Польшчы няпольскіх зямель быў К. Рылееў, які лічыў, што «там Русь, старажытны набытак наш». Наогул, праграмы польскіх патрыётаў і расійскіх дваранскіх рэвалюцыянераў не супадалі паміж сабой, што перашкаджала правядзенню перамоў. Дзекабрысты былі не супраць аднаўлення незалежнасці Польшчы і абяцалі дапамагчы ў гэтай справе, але жадалі, каб Польшча была рэспубліканска-дэмакратычная і ў этнічных межах. Напрыклад, П. Пестэль прызнаваў за Польшчай права яе аддзялення ад Расіі, але толькі пасля таго, як у ёй адбудзецца рэвалюцыя.

Царскі ўрад да 1822 г. не забараняў дзейнасць тайных таварыстваў на тэрыторыі імперыі, у тым ліку і ў беларуска-літоўскіх губернях. Таму што да пэўнага часу тайныя таварыствы Віленскага ўніверсітэта, Свіслацкай гімназіі, Полацкага піярскага вучылішча і іншыя займаліся культурна-асветніцкай дзейнасцю і не адыгрывалі ніякай ролі ў грамадска-палітычным жыцці краю. Нават больш сур’ёзная тайная польская арганізацыя «Патрыятычнае таварыства» (створаная ў 1821 г. на базе «Нацыянальнага масонства»), якая ставіла перад сабой мэту аднаўлення Польшчы шляхам паўстання, не змагла аказаць нейкага ўплыву на Літву. Яе эмісар Аборскі стварыў у Вільні літоўскае «Патрыятычнае таварыства» на чале з М. Ромэрам. Але яно, не маючы сувязей з Варшавай, практычна бяздзейнічала.

Больш за тое, трэба ўлічваць, што масонскія суполкі, якія існавалі на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, не мелі права самастойнай дзейнасці ў палітычным кірунку да таго часу, пакуль такое рашэнне не будзе прынята цэнтральным органам — кіраўніцтвам «Вялікага Усходу». У красавіку 1821 г. у Варшаве адбыўся сход магістраў масонаў, дзе яны пакляліся «быць гатовымі ахвяраваць за свабоду і незалежнасць Айчыны сваю маёмасць і нават сваё жыццё, «хутчэй ахвяраваць асабістае жыццё, чым адкрыць тайну суполкі».

Але расійскія ўлады ўсё ж адчувалі небяспеку з боку масонаў, суполкі якіх хутка стваraліся ў Польшчы і на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў. І не без падстаў. Спачатку яны пачалі пільна сачыць за кіраўнікамі галоўных варшаўскіх суполак. У 1822 г. паліцыі ўдалося арыштаваць некаторых кіраўнікоў польскіх масонаў. Пасля іх допыту былі атрыманы матэрыялы, якія сведчылі пра іх сапраўдныя палітычныя намеры. Пасля гэтага Аляксандру I не заставалася нічога іншага, як заканадаўча забараніць масонскія арганізацыі на тэрыторыі Расіі. 1 жніўня 1822 г. Аляксандр I рэскрыптам забараніў дзейнасць масонскіх ложаў і тайных таварыстваў па ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі. Пад уплывам паўстання дзекабрыстаў Мікалай I указам ад 21 красавіка 1826 г.паўтарыў гэты рэскрыпт.

Пасля гэтага летам 1826 г. у Мінскую губерню была накіравана спецыяльная камісія, якая займалася справамі масонаў. Яна складала спісы



Репозиторий БарГУ

членаў ложаў, якія тут існавалі, займалася фінансамі, іншай маёмасцю масонаў. Але прамых сувязей паміж мясцовымі масонамі і дзекабрыстамі знойдзена не было.

Між тым разгром дзекабрыстаў у Расіі прывёў да росту апазіцыйнага руху ў Царстве Польскім. Ідэі ўзброенага паўстання супраць самадзяржаўя, існавалі ў польскіх тайных таварыствах, знайшлі водгук і сярод студэнцкай моладзі Віленскага ўніверсітэта. У перыяд з 1827-га па 1828 г. ва ўніверсітэце было ўтворана тайнае таварыства «Сармацкае племя» (або «Прыхільнікі Айчыны»), мэтай якога было аднаўленне Польшчы як былога Польскага каралеўства і далучэнне адабраных ад яго правінцый. Пад канец 1830 г. дзейнічала Таварыства мнезераў, якім кіраваў Ю. Крашэўскі.

Репозиторий БарГУ

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Адамовіч, Г. Я.* З крыніц сусветнай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / Г. Я. Адамовіч. — Мінск : БелЭн, 1998. — 351 с.

2. Асветнікі зямлі Беларускай : X — пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2001. — 492 с.

3. *Баргдановіч, І. Э.* Авангард і традыцыя : Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — 387 с.

4. *Баршчэўскі, А.* Ян Чачот як чалавек і даследчык / А. Баршчэўскі // Беларусіка : у ? кн. — Мінск : ННАЦ, 1998. — Кн. 10 : Ян Чачот, Ігнат Дамейка — сябры і паплечнікі Адама Міцкевіча. — С. 30—38.

5. *Богословский, М. М.* Душа человеческая = Anima hominis / М. М. Богословский, И. В. Князькин. — М. : Сова, 2006. — 319 с.

6. *Борев, Ю. Б.* Эстетика / Ю. Б. Борев. — М. : Политиздат, 1988. 496 с.

7. Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 29 верас. 2006 г. — Мінск : Беларус. навука, 2006. — 167 с.

8. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі. — Мінск : Маст. літ., 1992. — 479 с.

9. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск : Беларус. навука, 2011. — Кн. 1. — 584 с.

10. Гісторыя беларускай літаратуры XIX — пачатак XX ст. : падруч. для філал. фак. пед. ВНУ / пад рэд.М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Мінск : Выш. шк., 1998. — 560 с.

11. Гісторыя беларускай літаратуры XI — XIX стагоддзяў : у 2 т. / навук. рэд. У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. — Мінск : Беларус. навука, 2007. — Т. 2 : Новая літаратура : другая палова XVIII — XIX стагоддзе. — 582 с.

12. *Даленга-Хадакоўскі, З.* Выбранае / З. Даленга-Хадакоўскі. — Мінск : Кнігазбор, 2007. — 448 с.

13. *Державин, Г. Р.* Стихотворения / Г. Р. Державин. — Л. : Худож. лит. Ленинград. отд-е, 1981. — 288 с.

14. Иеромонах Анатолий (Берестов). От блуда к… блуду // Врата небесные. — 2008. — № 1. — С. 6—7.

15. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении : Литов. и Белорус. Полесье : Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. — Мінск : БелЭн, 1993. — 550 с.

16. *Каваленка, В.* Вытокі. Уплывы. Паскоранасць : Развіццё беларускай літаратуры XIX—XX ст. / В. Каваленка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1982. — 362 с.


Репозиторий БарГУ

17. *Канапацкий, А. Я.* Духовность как онтологический компонент истинности человека / А. Я. Канапацкий // Социал.-гуманитар. знания. — 2004. — № 2. — С. 201—211.

18. *Каратынскі, В.* Творы / В. Каратынскі. — Мінск : Маст. літ., 2007. — 309 с.

19. *Каржаницкая, Т. В.* Эстетика / Т. В. Каржаницкая. — Минск : Равноденствие, 2004. — 351 с.

20. *Кісялёва, Л. Г.* Балады Яна Чачота: разбурэнне канону / Л. Г. Кісялёва // «Мае Афіны тут — назваў іх Бандарамі» // Acta Albaruthenica. — 2010. — Вып. 10. — С. 142—150.

21. *Кісялёў, Г. В.* Ад Чачота да Багушэвіча : Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. / Г. В. Кісялёў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 397 с.

22. *Козел, А. А.* Философская мысль Беларуси / А. А. Козел. — Минск : Амалфея, 2004. — 352 с.

23. *Кохан, Т.* Фальклорная аснова вобразаў птушак у паэзіі Яна Чачота / Т. Кохан // Фальклор і сучасная культура / рэдкал.: І. С. Роўда [і інш.]. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. — Ч. 1. — С. 153—154.

24. Краткая литературная энциклопедия : в 9 т. / под общ. ред. А. А Суркова. — М. : Совет. энцикл., 1972. — Т. 6. — 1039 с.

25. Литературный энциклопедическмй словарь / под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева ; редкол.: Л. Г. Андреев [и др.]. — М. : Совет. энцикл., 1987. — 751 с.

26. *Лойка, А. А.* Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд : падруч. для філал. фак. ВНУ: у 2 ч. /А. А. Лойка. — 2-е выд. дапрац. і дап. — Мінск : Выш. шк., 1989. — Ч. 1. — 319 с.

27. *Мальдзіс, А.* Выбранае / А. Мальдзіс. — Мінск : Кнігазбор, 2007. — 472 с.

28. *Мархель, У. І.* Прысутнасць былога : Нарысы, артыкулы, эсэ / У. І. Мархель. — Мінск : [б. в.], 1994. — 192 с.

29. Новейший философский словарь / сост. и гл. науч. ред. А. А. Грицанов. — 3-е изд, испр. — Минск : Кн. Дом, 2003. — 1 280 с.

30. *Рагойша, В. П.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. П. Рагойша. — Мінск : БелЭн., 2001. — 384 с.

31. *Рогалеў, А.* Свіцязь / А. Рогалеў // Родная прырода. — 1999. — № 4. — С. 27.

32. *Светова, Т.* Что есть духовность? / Т. Светова // Свет. Природа. Человек. — 2005. — № 8. — С. 46—47.

33. Телегония (теория) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http:// ru.wikipedia.org. — Дата доступа: 11.04.2014. — Загл. с экрана.

34. Уводзіны ў літаратуразнаўства : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / аўт.-уклад. М. І. Мішчанчук, М. Ф. Шаўлоўская. — 3-е выд. перапрац. і дап. — Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2004. — 364 с.

Репозиторий БарГУ

35. Философский энциклопедический словарь / ред.-сост.: Е. Ф. Губский, Г. В. Кораблева, В. А. Лутченко. — М. : ИНФРА-М, 1997. — 575 с.

36. Философия : энцикл. слов. / под ред. А. А. Ивина. — М. : Гардарики, 2004. — 1 072 с.

37. *Чачот, Я.* Выбраныя творы / Я. Чачот ; уклад. К. Цвірка. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. — 374 с.

38. *Чачот, Я.* Наваградскі замак : творы / Я. Чачот. — Мінск : Маст. літ., 1989. — 327 с.

39. *Штэйнер, І. Ф.* Польскамоўная літаратура Беларусі / І. Ф. Штэйнер. — Гомель : ГДУ, 2004. — 183 с.

40. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. савец. энцыкл. імя П. Броўкі, 1984. — Т. 1. А—Г (Акапэла—габелен). — 726 с.

41. *Яскевич, А. С.* Становление белорусской художественной традиции / А. С. Яскевич. — Минск : Наука и техника, 1987. — 232 с.

42. *Яскевич, А. С.* Духоўнасць старога пісьменства / А. С. Яскевіч // Полымя. — 1996. — № 10. — С. 253—254.

43. *Яскевич, А. С.* Природа в свете Библии / А. С. Яскевич. — Минск : Царкоўнае слова, 2003. — 167 с.

Репозиторий БарГУ

## КЛЮЧЫ ДА АБАГУЛЬНЯЮЧАГА ТЭСТА

**Частка А**

**А1)** г; А**2)** б, в, г, д, е, ж**; А3)** г**; А4)** в, д; **А5)** б, д, е; **А6)** а, в; **А7)** б; **А8)** в, д; **А9)** г.

**Частка Б**

**Б1) «**Узногі»; **Б2)** народнага падання; **Б3)** «Свіцязь»; **Б4)** «Як добра, калі мужык», «Каб у карчме не сядзеў», «Пакуль сонца ўзыдзе», «Поле, поле шырокае»; **Б5)** «Сялянскія песенькі з-пад Нёмана і Дзвіны»; **Б6)** «Спевы пра даўніх ліцвінаў...».

Репозиторий БарГУ

## ЗМЕСТ


*Прадмова* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Раздзел 1 **Ян Чачот — прадстаўнік новай беларускай літаратуры** . . .
Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў . . . . . 4
Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Раздзел 2 **Эстэтычны ідэал паэзіі Яна Чачота** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў . . . . . 9
Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў. . . . . . . . . . . .. . . . . . . . . 9
Раздзел 3 **Асаблівасці праяўлення эстэтычнага ідэалу Яна Чачота ў межах сентыменталізму, рамантызму і рэалізму** . . . . . . . . . . . . . . . .
Пытанні і заданні для самападрыхтоўкі і семінарскіх заняткаў . . . 15
Пытанні і заданні да мастацкіх тэкстаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Абагульняючы тэст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
*Дадатак А* Тайныя таварыствы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .. . . . . . . . . . . 35

Спіс рэкамендаваных крыніц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Ключы для абагульняючага тэста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40


Репозиторий БарГУ